**216.** Спішыце, падкрэсліце назоўнікі. Вызначце ўсе вядомыя вам марфалагічныя прыметы назоўнікаў: нязменныя (агульны ці ўласны; адушаўлёны ці неадушаўлёны; канкрэтны ці абстрактны; зборны, рэчыўны; род, скланенне) і зменныя (склон, лік).

Хай свята дружбы будзе лепшым святам,
Хай векам дружбы наш завецца век,
Хай другу друг заўсёды будзе братам,
І другам — чалавеку чалавек.
Заўжды хто-небудзь некага чакае,
Заўжды хто-небудзь некага шукае —
Патрэбен чалавеку чалавек...

*С. Грахоўскі.*

## § 36. Скланенне назоўнікаў, якія абазначаюць імёны, прозвішчы і назвы населеных пунктаў на *-оў, -ёў, -еў, -аў, -ын, -ін*

**217.** Працытайце табліцу. Пісьмова праскланяйце ўласныя назоўнікі. Параўнайце канчаткі прозвішчаў і назваў населеных пунктаў. Зрабіце вывад аб правапісе канчаткаў гэтых назоўнікаў у творным і месным склонах.

| Склон | Канчаткі | Прозвішчы | Склон | Канчаткі | Назвы населеных пунктаў |
|---|---|---|---|---|---|
| Н. | | *Барадулін*□<br>*Куляшоў*□ | Н. | | *Кобрын*□<br>*Тураў*□ |
| Р. | *-а* | | Р. | *-а* | |
| Д. | *-у* | | Д. | *-у* | |
| В. | *-а* (як Р.) | | В. | □ (як Н.) | |
| Т. | *-ым* | | Т. | *-ам* | |
| М. | *-у* | | М. | *-е* | |

Складзіце і запішыце тры сказы, выкарыстоўваючы назвы населеных пунктаў на ***-оў, -ёў, -еў, -аў, -ын, -ін***. Растлумачце іх правапіс.



Правообладатель Национальный институт образования

**218.** Адкажыце на пытанні краязнаўчай віктарыны «Гарады Беларусі». Складзіце сказы, выкарыстоўваючы інфармацыю, пададзеную ў дужках.

1. Пад якім горадам да пачатку 1990-х гг. размяшчаўся гарнізон марской авіяцыі Балтыйскага флоту? *(Быхаў.)*
2. На гербе якога горада знаходзяцца чырвоная лісіца і рука, што трымае меч? *(Мсціслаў.)*
3. Сімвалам якога горада з'яўляецца вежа з гадзіннікам? *(Шчучын.)*
4. У якім горадзе знаходзіцца помнік князю Барысу? *(Барысаў.)*
5. У якім беларускім горадзе знаходзіцца помнік агурку? *(Шклоў.)*

Запішыце сказы. Падкрэсліце назвы гарадоў. Абазначце канчаткі і вызначце склон гэтых назоўнікаў. Вусна пастаўце назоўнікі, якія абазначаюць назвы гарадоў, у форму творнага склону. Якія канчаткі яны маюць?

**219.** З прапанаваных слоў складзіце сказы. Запішыце тэкст. Падбярыце да яго загаловак.

Гарады, зямля, беларуская, адрозніваецца, свая, непаўторнасць, свае, здабыткі. Адны, славіцца, старажытнае, мінулае, і, гістарычныя, падзеі. Другія, ганарыцца, адметныя, архітэктурныя, помнікі, і, прыгажосць, сучасныя, збудаванні.

Гарады, Кіеўская Русь, самыя, старажытныя, гарады, на, тэрыторыя, Беларусь. У, трынаццатае, стагоддзе, на, тэрыторыя, наша, краіна, быць, каля трыццаці, гарады. Яны, з'яўляцца, цэнтры, рамяство, і, гандаль *(Паводле У. Малішэўскага)*.

● Знайдзіце сказы з аднароднымі членамі, назавіце рады аднародных членаў.

Успомніце назвы старажытных беларускіх гарадоў. Складзіце іх спіс. Перакажыце тэкст, дапоўніўшы яго звесткамі пра старажытныя гарады, якімі славіцца Беларусь. Уключыце ў пераказ сказы з уласнымі назвамі ў форме творнага склону адзіночнага ліку.

**220.** Вусна перакладзіце тэкст на беларускую мову.

В историю русской культуры оказались включенными судьбы многих в разной мере замечательных людей. С белорусскими



Правообладатель Национальный институт образования

землями они связаны географией рождения или родословной. Это Иван Фёдоров (первопечатник), Симеон Полоцкий, Булгарин, Михаил Глинка, Писарев, Достоевский, Пржевальский, Ковальская, Стравинский, Шостакович, Щерба *(По Н. Мечковской)*.




## Слоўнік

судьба — *лёс*
замечательные люди — *знакамітыя (славутыя) людзі*
родословная — *радавод*

Запішыце прозвішчы па-беларуску, паставіўшы іх у формы творнага і меснага склонаў. Растлумачце правапіс канчаткаў.

● Знайдзіце ў тэксце назоўнікі са спалучэннем ***-ео***. Запішыце іх па-беларуску.

Пра дзейнасць каго з пералічаных знакамітых людзей вы ведаеце? Выкарыстоўваючы інтэрнэт-крыніцы, даведайцеся і сцісла раскажыце, чым славутыя гэтыя людзі.

**221.** Прачытайце верш.

Запрасілі Маргарыту
Пагасціць у Маларыту.
А ў Ружанах і Пружанах
Пабывала летам Жанна.
Лёва з Буда-Кашалёва
Вандраваў да Магілёва.
Лепшы ў свеце для Барыса
Горад з назваю Барысаў.
Вельмі любяць, уявіце[ф],
Ліду — Ліда, Віцебск — Віця,
Слава — Слаўгарад, а Люба
Для сябе адкрыла Любань,
Света — Ветку, Казімір —
Старажытны замак[л] Мір.
Назбіраў парэчак збан
За Іванавам Іван.
З Васілевічаў Васіль
Вёз матулі дзівасіл.
Шмат сяброў знайшоў, калі
Быў у Клімавічах Клім.
Назвы, родныя здавён,
Нагадалі шмат імён.

*У. Мазго.*

Знайдзіце ў вершы назвы населеных пунктаў на ***-ёў (-ёва), -аў (-ава)***. Запішыце іх, паставіўшы ў формы назоўнага, творнага і меснага склонаў.


Правообладатель Национальный институт образования